http://www.darial-online.ru/2004_5/bahrah.shtml

3 Иванов, В. В. Избранные труды по семиотике и истории культуры. Т. 3: Сравнительное литературоведение. Всемирная литература. Стиховедение / Ин-т мировой культуры МГУ / В. В. Иванов – М.: Языки славянской культуры, 2004. – 816 с., ил.

4 Шевеленко, И. Д. Литературный путь Цветаевой: Идеология – поэтика – идентичность автора в контексте эпохи / И. Д. Шевеленко – М.: Новое литературное обозрение, 2002. – 464 с.

5 Маслова, В. А. Поэт и культура: концептосфера Марины Цветаевой [Электронный ресурс] : учеб. пособие / В. А. Маслова. – 2 изд., стер. – М.: ФЛИНТА, 2012. – 256 с.

6 Иванова-Лукьянова, Г. Н. Ритмика стихов М. Цветаевой. Альманах “Академические тетради”. Выпуск тринадцатый. Единая интология / Г. Н. Иванова-Лукьянова [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.independent-academy.net/science/tetradi/13/index.html

7 Цветаева, М. И. Полное собрание стихотворений [Электронный ресурс] / М. И. Цветаева. – М.: Эксмо, 2006. – Режим доступа: http://royallib.ru/read/tsvetaeva_marina/polnoe_sobranie_ stihotvoreniy.html#0

8 Марина Цветаева и музыка [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://sites.google.com/site/gim1lisova/naucno-pedagogiceskaa-deatelnost/marina-cvetaeva-i-muzyka

УДК 821.161.3:316.243-544.4

К. М. БАНДУРЫНА
(г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны)

# ВЫЯЎЛЕННЕ АНТРАПАЛАГІЧНАГА КАТАРСІСУ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

За ўсю сваю гісторыю чалавецтва не аднойчы сутыкалася з рознымі выпрабаваннямі: экалагічнымі катастрофамі, прыроднымі катаклізмамі, эпідэміямі і войнамі. *Усё пералічанае пакідала свой след як на навакольным свеце, так і на абліччы чалавека.* У залежнасці ад абставін (часу, месца, дзеянняў) гэтае аблічча змянялася па-рознаму. Гэты працэс адлюстроўваецца многімі аўтарамі сусветнай літаратуры з самага пачатку яе ўзнікнення як асобнага віду мастацтва. Маральны распад чалавека і яго духоўная эвалюцыя сталі фундаментальнымі паняццямі, праз якія вядомыя пісьменнікі імкнуцца данесці да свайго чытача асноўныя прынцыпы, законы і догмы жыцця грамадства. Па сутнасці, менавіта праз апісанне эвалюцыі асобнага персанажа праходзіць працэс выхавання цэлай супольнасці. Якім чынам гэта знайшло свой адбітак у беларускай літаратуры, можна высветліць, прааналізаваўшы найбольш рэзанасныя ў свой час творы беларускіх пісьменнікаў ХХ стагоддзя.

Паняцце асобы з’явілася ў літаратуры адносна нядаўна. Толькі апошнія два стагоддзі пісьменнікі разглядаюць чалавека не як абагулены вобраз, а як індывідуальную асобу з яе адметнасцямі характару, паводзінаў і светаўспрыняцця. Метад псіхалагізму ў літаратуры дае магчымасць не толькі для больш рэальнага паказу жыцця, але і для выхаваўчай функцыі, падрыхтоўкі чытача да гэтага жыцця ў грамадстве. Безумоўна, чытанне кніг развівае асобу. Але гэты працэс часцей за ўсё адбываецца падсвядома. Прычым за гэтай падсвядомасцю немагчыма разгледзець, у які бок рухаецца развіццё свядомасці: *станоўча літаратура выхоўвае не ўсіх.*

У сваім артыкуле “Пасрэднасць як сацыяльнае зло” Вольга Седакова выказвае такую думку: “*Тое, чым займаецца мастацтва, можна назваць пашырэннем сэрца. Пераадоленнем уласнай дадзенасці… Мастак звяртае ўвагу на тое нябачнае зло, пра якое паўсядзённая мараль забывае ці, нават, спрыяе таму, каб гэтая невядомая загана – загана пасрэднасці – развівалася і адчувала сябе гаспадыняй становішча*” [1].

Для таго, каб асоба развівалася ў напрамку самаўдасканалення, пашырэння сваёй свядомасці, на думку аўстрыйскага псіхолага Віктара Франкла, чалавек павінен мець сэнс жыцця. Толькі пры ўмове знаходжання гэтага сэнсу асоба будзе развівацца, удасканальвацца і захоў-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКО

ваць уласную годнасць пры любых умовах. Калі ж сэнс адсутнічае, страчваецца ці яшчэ не знойдзены, адбываецца паступовая дэградацыя асобы. “*Быццё чалавека заўсёды арыентавана зусім не на нешта, што не з’яўляецца ім самім, на штосьці ці на кагосьці: на сэнс, які неабходна ажыццявіць, ці на іншага чалавека, да якога мы цягнемся з любоўю. У служэнні справе ці любові да іншага чалавек ажыццяўляе сам сябе. Чым болей ён аддае сябе справе, чым больш ён аддае сябе свайму партнёру, тым у большай ступені ён з’яўляецца чалавекам і тым у большай ступені ён становіцца самім сабой. Такім чынам, ён, па сутнасці, можа рэалізаваць сябе толькі ў той ступені, у якой ён забывае пра сябе, не звяртае на сябе ўвагі* ” [2, с. 8]. У сувязі з гэтай канцэпцыяй псіхолагамі з розных краін былі праведзены апытанні асобных сацыяльных груп. Вынікі гэтых апытанняў былі не суцяшальнымі: найбольш выразна адсутнасць сэнсу жыцця праяўлялася ў злачынцаў, людзей адкрыта крымінальнага характару. “*На самой справе агрэсіўныя імпульсы разрастаюцца перш за ўсё там, дзе відавочны экзістэнцыйны вакуум*” [2, с. 10].

Напэўна, гэта была адна з тых магчымасцяў, якой удала скарысталіся нацыянал-сацыялісты ў Германіі і камуністы ў СССР. Адлюстраванне працэсу дэградацыі тагачаснага грамадства цалкам выпала на долю той літаратуры, якая, у большасці сваёй, была і застаецца забароненай да гэтага часу. Па сутнасці, тэма палітычных рэпрэсій існуючымі ў XX стагоддзі рэжымамі не раскрыта і ў сучасным літаратуразнаўстве. Большая частка твораў, напісаных па ўспамінах саміх аўтараў і тых, каго яны ведалі, застаецца невядомай шырокім масам. Творы такіх пісьменнікаў, як, напрыклад, Ларыса Геніюш (“Споведзь”), не вывучаюцца ў школах, не асвятляюцца крытыкамі, іх амаль немагчыма знайсці ў крамах, што з пункта погляду літаратуры, гісторыі, антрапалогіі, выхавання чалавека недапушчальна.

“Споведзь” Ларысы Геніюш адлюстроўвае розныя бакі экзістэнцыі чалавека: як станоўчыя, так і негатыўныя. У розных праявах жыцця чалавек паводзіць сябе па-рознаму. У такім становішчы галоўная задача пісьменніка – перадаць аб’ектыўную рэчаіснасць, не заўважаючы ўласных перажыванняў. У Ларысы Антонаўны адсутнічае прамая ацэнка дзеянняў суайчыннікаў, але час ад часу прагледжваюцца адносіны самой аўтаркі да таго, што адбывалася: “*Людзі зрабіліся як зьверы, яны вырывалі адзін другому з рук убогія лахманы й старыя рэчы. Напаверх выплыла ў людзях найгоршае. Усякая шляхотнасьць у асяродзьдзі бальшавікоў выдаецца “буржуазным предрассудком”, нечым так ненармальным, як некалі – подласць. Вартасьць чалавека мерылася не яго чынамі, пражытым жыцьцём, а той толькі шызафрэнічнай ярасьцю, з якою ён хваліў некалі Сталіна, а цяпер тое, што славілі заместа яго. Людзі пашалелі ад дзікага*” [3, с. 73]. Скрозь усю кнігу праходзяць супрацьпастаўленні аднаго чалавека другому, адной нацыі – іншаму народу. Апісанне падзей пацвярджае думку пра ўстойлівае змаганне і развіццё асобы, калі ў яе ёсць для гэтага сэнс, і поўную маральную і фізічную дэградацыю, калі сэнсу няма: “*Хрысціяне сябе нейк узаемна пазнавалі… усюды на поўначы панаваў аўтамат, як і ў літаратуры, як і ў гульнях дзяцей да сяньняшніх дзён… гэтыя аўтаматы так доўга заглядалі нам у вочы, што сяньня яны здаюцца нам сімвалам камунізму, супраць якога ў нас заставаўся – крыж. Адзіны, беззаганны й бясстрашны, які не пакінуў нас у нашых суровых выпрабаваньнях – нашая мужнасьць і нашая сіла*” [3, с. 241].

Наконт распаду асобы выразна выказалася Вольга Седакова: “*Калі зло – як у тыя часы, аб якіх мы гаварылі – прымае адкрыта інфернальныя формы, а пакуты пераўзыходзяць усе межы (пры Гітлеры ў Германіі, пры Сталіне ў нас), тады саюз са злом ці нават мірнае з ім суіснаванне робяць для чалавека немагчымай сустрэчу са сваім унутраным светам, з яго “старой праўдай”…*” [1].

Пытанне пра заняпад чалавечай годнасці востра паўстала і ў творах Сяргея Грахоўскага. Яго аповесць “Зона маўчання” – гэта разважанні аб сутнасці і межах маралі і амаральнасці, грахоўнасці і духоўнай прыгажосці асобы. Гэта доўгі роздум над лёсам чалавецтва, увасоблены ва ўспамінах аб лёсах асобных людзей: ахвярах і карніках, якіх аўтар сустрэў на сваім

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

жыццёвым шляху. Мастацкасць выкладання матэрыялу дазваляе глыбей зазірнуць у сутнасць праблемы, якую складаюць не проста пытанні агульначалавечага характару, праблема насамрэч нашмат глыбей: раздзяляльная мяжа несправядлівасці паміж *сваімі*, з аднаго боку, і *сваімі* – з другога. Адсутнасць сэнсу жыцця ва ўмовах *прымусовага* сацыялізму аўтаматычна каталізуе заняпад маральных каштоўнасцей сярод заўзятых прыхільнікаў такога прымусу: "*Хто страляў? Нібыта ніхто не ведае. А недзе ж у справах ёсць іх подпісы пад актамі аб прывядзенні прысуду ў выкананне, недзе ж яшчэ жывуць натрэніраваныя ў стральбе па жывых мішэнях «варашылаўскія стралкі»... А сумленне? Не муляе і не мучыць. Чаго не было, таго няма. За многія гады духоўнага спусташэння гэтая маральная катэгорыя назаўжды страчана ў паслухмяных служак і прыслужнікаў крывавага рэжыму, гатовых выканаць любы бязглузды і злачынны загад. Яны, як манкурты, па загадзе родную маці застрэляць*" [4, с. 134]. Псіхалогія пасрэднасці спрацоўвае на самым прымітыўным узроўні – фізіялагічным. Агрэсія з'яўляецца рэакцыяй на раздражненне псіхікі словам, загадам, дактрынай, а вынік гэтай агрэсіі часта бывае непрадказальным. Пісьменнік спрабуе знайсці адказы на свае пытанні, якія не давалі спакою многім з тых, хто прайшоў праз пакуты канцлагероў: "*Якому д'яблу служаць тыя, што апантана ламалі рэбры старым камуністам, што жанчынам заганялі ў саскі завостраныя алоўкі, што ножкамі крэслаў раструшчвалі пальцы ног і месяцамі гнаілі ў халодных і цёмных карцэрах*?" [4, с. 107]. Адказы на гэтыя пытанні крыюцца недзе глыбока ў прасторах падсвядомага, асаблівасці якога дагэтуль яшчэ не вывучаны. А вось асаблівасці свядомасці савецкім уладам былі добра вядомыя. Карыстаючыся разгорнутымі ў той час шырокімі даследаваннямі ў псіхалогіі, педагогіцы і іншых дысцыплінах, органы ГПУ спрабавалі ўплываць на шырокія масы і пры дапамозе літаратуры. Загнаных у канцлагеры пісьменнікаў актыўна агітавалі да працы на карысць Саветаў, да ўхвалення камуністычнага рэжыму, калі ж проста словамі не атрымлівалася, уплывалі фізічна, збіваючы да смерці, ці маральна – праз пакуты блізкіх: "*... жонку з дзіцём на руках выселілі з ведамаснай кватэры, выключылі з інстытута. Без прытулку і грошай да самых маразоў яны начавалі ў скверы на плошчы Волі, і сябры і знаёмыя пазбягалі, баяліся даць прытулак. Калі пахавала сына, падалася на нейкі торфазавод, і нашы шляхі разышліся назаўсёды*" [4, с. 135].

Але нават у такіх абставінах людзі захоўвалі сумленне і знаходзілі сэнс жыць. У многім дзякуючы менавіта гэтаму сэнсу тыя рэпрэсаваныя пісьменнікі, чые кнігі мы зараз чытаем, змаглі вытрымаць катаванні і выжыць. Падставы верыць у нешта у кожнага былі розныя. У кагосьці па той бок дроту былі дзеці ці бацькі, хтосьці быў адданы радзіме, а кагосьці проста падтрымлівалі сябры і аднадумцы. Сярод такіх і выпала быць Сяргею Грахоўскаму. "*Павярнула на вясну... задубянелі ад маразоў рукі, на нагах, асабліва ў цяпле, нылі і торгалі прымарожаныя пальцы. Але трымала нас сяброўская еднасць*" [4, с. 124].

Пра нападкі на пісьменнікаў гаворыць і Алесь Адамовіч у сваёй аповесці "Vixi", якая цалкам не кранае тэму канцэнтрацыйных лагероў і рэпрэсій. Збольшага гэта даніна памяці маці, мужнай і вартай усялякай павагі жанчыне, якая ў небяспечныя для многіх часы ратавала жыцці "ворагам народа". Але некаторыя моманты Адамовіч не абмінуў. Так, напрыклад, ён узгадвае неаднаразовыя даносы на іх сям'ю з боку суседзяў, у якіх на той час сям'я Адамовічаў здымала пакой. Гэтыя даносы не мелі наступстваў, пакуль дзеці былі малымі. Даносчыкаў "успомнілі", калі пісьменніцкая дзейнасць Алеся Адамовіча стала замінаць Саветам: "*Бо яны ж, «органы», не толькі на вуліцы Урыцкага, а і «пад суседзьмі» – у любым будынку-ўстанове. І вядома ж – у Саюзе беларускіх пісьменнікаў. А ў нас там свае страсці, асабліва калі ты крытык і не цэніш «вытворчыя раманы». Нейчае цярпенне лопнула («Якая табе справа, што мае раманы тоўстыя, сумныя – твае, ці што, грошы?!»), і я раптам даведаўся: расшукалі Казіка Пагоцкага..., ад яго прыйшло пісьмо, і ўсе цяпер маглі даведацца, пераканацца, што не толькі Адамовіч-сын – чалавек сумніцельны, але і яго маці...*" [5, с. 96]. На фоне такога маральнага заняпаду чалавека выразна паказана абсалют-

ная духоўная чысціня сапраўднай асобы. Пісьменнік быццам супрацьпастаўляе маці і ўвесь астатні сусвет: “*Тады я маму не дужа разумеў, затое зразумеў пазней. Так, менавіта пасля такой вайны, такога ўсплёску нянавісці, лютасці, трэба было пачынаць перарываць ланцуг, хаця б на сваім узроўні, участачку. Наўрад ці яна пра гэта думала або так разважала. У яе свае доказы: яна адмаліла сыноў у Бога, і цяпер не яна, а Ён усяму суддзя*” [5, с. 91]. Для гэтага чалавека выратавальнай сілай былі дзеці.

Васіль Быкаў у прыпавесці “Жоўценькі пясочак” не адлюстроўвае такіх характараў, якія маглі б пацвердзіць тэорыю Віктара Франкла. Але ён выразна паказвае на прыкладзе сваіх персанажаў аблiччы тых, хто дзейнічаў на баку зла ў гады камуністычнай улады. Асуджаныя на смерць, яны не маюць у сабе ніводнага шансу для дальнейшага існавання, якога аўтар пазбаўляе сэнсу. Прыпавесць не мае пад сабою ніякіх фактаў, але можна лічыць, што апісаныя Быкавым героі – абагулены вобраз усіх, хто стаяў у тыя часы не на баку справядлівасці: “*Да таго ён гатовы быў месяц таму, нават да суда, ведаў, яго не памілуюць. Стрэльнуць. Бо тое, што яму прад’явілі для абвінавачвання, увогуле было папраўдзе: дапушчаў і перавышэнне, і незаконныя метады – і біў, і ламаў косці – даваў дразда. Але ж хіба ён адзін? У іхнім упраўленні так працавалі ўсе – стараліся, не спалі начэй, выбівалі ўсё, што можна было выбіць з арыштаваных*” [6, с. 514].

Васіль Быкаў, як і вышэй узгаданыя аўтары, таксама не абмінае тэму ўздзеяння савецкіх органаў бяспекі на літаратуру і літаратараў. Адзін з яго персанажаў, Фелікс Гром, уяўляе сабою партрэт тых з пісьменнікаў і паэтаў, хто дзеля захавання жыцця падаў на самае дно, адмаўляючыся ад уласнай асобы і прынцыпаў: “*Не адразу, мабыць, толькі тут, у турме, Фелікс зразумеў, што трапіў у пастку не таму, што пачаў пісаць вершы, а што пачаў іх пісаць па-беларуску. Расейскія вершы не выклікалі да сябе і дзесятай долі тае ўвагі з боку рэдактараў і крытыкаў, якую выклікалі беларускія. І ён думаў цяпер, які д’ябал падбіў яго да паэзіі, тым больш – беларускай*” [6, с. 524]. Гэтае адмаўленне нагадвае страту аблічча, змену маскі, прыставанне да тых умоў, у якіх лепш за ўсё існуе і разносіцца ў паветры зараза.

У кнізе Віктара Франкла “Чалавек у пошуках сэнсу” адзначаецца наступнае: “… *нельга не ўзгадаць дадзеныя Блэка і Грэгсана з Новай Зеландыі, згодна з якімі ўзровень фрустрацыі ў злачынцаў істотна вышэй за сярэдні*” [2, с. 9]. Адсутнасць сэнсу руху наперад спрыяе адваротнаму працэсу развіцця асобы – яе дэградацыі, якая пачынаецца ўнутры чалавека і з цягам часу выходзіць на яго аблічча.

Такім чынам, існуе шмат фактараў, сукупнасць якіх каталізуе адмоўныя працэсы ўнутры асобнага чалавека і ўсяго грамадства ў цэлым. Гэтыя фактары становяцца спрыяльнымі для асобных яго членаў у тым выпадку, калі сітуацыя ў краіне дазваляе ім браць уладу ў свае рукі. Адным з такіх фактараў з’яўляецца стварэнне ўмоў для знікнення ў асобнага індывіда ўсялякіх праяў свядомасці, у тым ліку сэнсаў, мэт, жаданняў. Ва ўмовах поўнай падпарадкавальнасці сістэме гвалт выходзіць на паверхню і дасягае жудасных маштабаў. Разгледжаныя намі творы беларускай літаратуры выразна адлюстроўваюць гэтыя тэзісы і пацвярджаюць думкі вядомых даследчыкаў Віктара Франкла і Вольгі Седаковай адносна ролі некаторых з’яў у грамадскім і палітычным жыцці чалавека.

**Спіс літаратуры**

1 Седакова, О. Посредственность как социальное зло [Электронны рэсурс] / О. Седакова. – Рэжым доступу: http://www.olgasedakova.com/Moralia/280. – Дата доступа: 06.09.2014.
2 Франкл, В. Человек в поисках смысла / В. Франкл. – М.: Прогресс, 1990. – 196 с.
3 Геніюш, Л. Споведзь / Ларыса Геніюш. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1993. – 270 с.
4 Грахоўскі, С. Выбраныя творы / Сяргей Грахоўскі. – Мн.: Беларускі кнігазбор, 2007. – 544 с.
5 Адамовіч, А. Vixi / А. Адамовіч // Полымя. – 1993. – Лістапад (775). – С. 3 – 107.
6 Быкаў, В. Выбраныя творы / Васіль Быкаў. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2004. – 672 с.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ